**Ермаковіч В.У. (Мядзел)**

## Нацыянальны фальклор у ранняй паэзіі Максіма Танка

Мастацкая муза паэта зарадзілася ў звонкім шуме сасновых нарачанскіх лясоў. Чорныя скібы палёў, пеністыя хвалі Нарачы і Мястры – былі калыскай паэта. Малюнкі роднай прыроды ўтойвала, убірала дзіцячая, а пасля юнацкая душа паэта, які пасля стане заснавальнікам рэвалюцыйнай літаратуры ў былой Заходняй Беларусі, адным з найбольш папулярных паэтаў у наш час. Гэта Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко).

Цяжкі лёс выпаў на долю Максіма Танка, цяжкі, але шчаслівы. У 5-гадовым узросце ён уступіў у Камуністычны Саюз моладзі Заходняй Беларусі, актыўна ўключаўся ў барацьбу супраць буржуазнай Польшчы на Віленшчыне і Навагрудчыне. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі – Вялікая Айчынная вайна, пасляваенны час, нялёгкія будні. Усе перыяды жыцця нашага народа знаходзім у яго лірыцы. Яго творчы шлях непаўторны, самабытны, ні з кім не параўнальны. Максім Танк – гэта асоба, сапраўдны волат паэтычнага духу, філосаф і лірык сусветнага значэння.

У яго паэзіі адбіўся наш час, супярэчлівы і складаны. Паэт ніколі не забываў, што галоўная яго справа – творчасць. Нават займаючы высокія пасады (ён шмат гадоў быў старшынёй Саюза пісьменнікаў, герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай прэміі), ён перш за ўсё заставаўся, як і ў гады сваёй маладосці, паэтам. Паэтаў шмат на Беларусі, а Максім Танк у нас адзін.

Працэс фарміравання творчай індывідуальнасці Максіма Танка, яго мастацкага стылю сваімі вытокамі звернуты ў сівую даўніну, да нацыянальных каранёў, духоўных скарбаў беларускага народа; у яго аснове – няспынны пошук, пастаяннае ўдасканаленне майстэрства. Пры гэтым на цярністым шляху да выдатнага паэта Максіма Танка ў пачынаючага заходнебеларускага аўтара ляжаў яшчэ вялікі па плошчы і шчыльна населены мацярык сусветнай літаратуры.

Максім Танк нарадзіўся ў вёсцы, выхоўваўся ў спадчынскай сялянскай сям'і. Далучанасць да земляробчага ўкладу жыцця садзейнічала таму, што ў надзеленым успрымальнай душой і чулым сэрцам хлопчыку вельмі рана абудзілася цяга да пранікнення ў вабныя сферы маляўнічага наваколля, вытлумачэння яго складаных і супярэчлівых сувязяў і ўзаемадачыненняў. Патрапіўшы пад дабратворнае ўздзеянне прыродных чараў, іх высокай эстэтыкі, ён засведчыў імкненне да разгадкі, шматстайных таямніц расліннага і жывёльнага свету. Здавалася б, зусім нязначныя, і, на першы погляд, невыразная праява – дэталь прыроды для будучага паэта заключала пэўную прычынна-выніковую абумоўленасць і заканамернасць, глыбокую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

псіхалагічную індывідуалізаванасць і непаўторнасць, прымушала задумацца над шмат якімі жыццёвымі пытаннямі, абуджала ўяўленне і фантазію. Нездарма, прыгадваючы час, праведзены ў бежанстве, у аўтабіяграфіі ён адзначае наступнае: “Калі бацькі ўспаміналі пакінутыя родныя мясціны, перад маімі вачамі ўставалі: парослае густой муравой дварышча, старая пачарнелая хата з маленькімі квадратамі шыбін, разрыты катлаван студні, цёмная сцяна лесу… І чамусьці асабліва запомнілася мне малацьба цапамі і невялічкае акенца ў таку, праз якое відаць было балота з іржавымі рэчалінамі, зыбунамі, выгарамі – вечным прыстанішчам кулікоў, чэпігаў, кнігавак…”

Народная мудрасць з яе незвычайна багатым вопытам сівых вякоў і шматлікіх пакаленняў з самага ранняга ўзросту ўплывала на фарміраванне будучага творцы, пакідала ў яго свядомасці незабыўныя ўражанні. Ён міжволі засвойваў элементы спаконвечнага народнага светаўспрымання, якое “характаразуецца нечым больш, чым уяўленні пра аб’ект: яно валодвае ім і яно ім апанавана. Гэта ўнутраныя і непасрэдныя зносіны істотаю праз інтуіцыю, праз узаемапранікненне, праз узаемапрычышчэнне суб’екта і аб’екта, праз поўную супрычыннасць”. Фальклорныя радовішчы абсалютна абгрунтавана звязваюцца з асаблівасцямі духоўна-творчай культуры нацыі, яе філасофскім патэнцыялам; гэта “зберагальнік здаровых духоўных норм жыцця”, важнае этнічна жыццёвае дзеянне”, крыніца веры і натхнення, чысціні і высокай эстэтыкі. У многім якраз адсюль вырастаў Максім Танк як мастак і нацыянальны паэт.

Максім Танк быў добра дасведчаны ў праблемах жыцця беларускай вёскі, асаблівасцях вуснай народнай тварчасці, сістэматычна займаўся зборам і вывучэннем фальклору. Дзённікавыя нататкі паэта поўняцца красамоўнымі запісамі: “У музейнай бібліатэцы напазычыў розных слоўнікаў ад Насовіча да Ластоўскага – і зараз цэлымі днямі і начамі чытаю… Аж страх узяў – з якім абмежаваным і бедным слоўным багажом выправіўся я на “Парнас”; “Чытаю Панфілава, Шэйна і Сержпутоўскага… Сяджу над галашэннямі Шэйна. Столькі ў іх цяжкага і жудаснага, што аж страх чытаць…” [1, с. 123].

Фальклорная заангажаванасць ранняй лірыкі М.Танка галоўным чынам зводзіцца да шматстайнай варыятыўнасці ў распрацоўцы традыцыйных народных тэм, матываў, вобразаў.

Ёсць падставы меркаваць, што паэт не абмінаў сваёй увагай дэманалогію, скарыстоўваў міфалагічныя вобразы, народную фантастыку. У якасці прыкладу з’яўляюцца радкі з верша “Санет”:

Заснула казка на акне маім астрожным:
Бялеюць грэбні неабсяжных гор,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Над імі – лесу цёмнага ўзор
На небасхіле змрочным і трывожным.
Звяры там з лесуном пужаюць падарожных,
Там вадзянік жыве ў глыбі азёр,
Чараўнікам прыкуты да скалы арол,
Галосіць вецер там між пуцявін дарожных… [2, с. 36]

Даўно даказана, што “чараўніцы, вадзянікі, ведзьмы, лесавікі, дамавікі, русалкі напаўняюць прыроду беларуса і надаюць ёй своеасаблівасць. Прырода ў светасузіранні народа не толькі арэна яго зямнога жыцця, але і спадарожніца яго духу”. Вобразы міфалагічных істот, якія арганічна паяднаны з навакольнымі з’явамі, варта разглядаць не проста ў якасці нейкага абстрактнага нацыянальнага фону. У ім выявілася імкненне паэта да акцэнтацыі значнасці народнай глебы, нацыянальных каранёў, вялікіх залежаў духаўнага патэнцыялу беларусаў.

Многія з ранніх твораў Максіма Танка (яны склалі зборнік “На этапах”) выявілі ў ім аўтара, глыбока дасведчанага ў пытаннях народнай лірыкі “Аднекуль з’явілася мелодыя. Яна кужэльнай ніткай пацягнула за сабой вобразы, вобразы-рыфмы, апошнія ляглі ў верш. А ўвесь гэты абвал выклікала мелодыя забытай матчынай песні, словы якой не магу аднавіць у памяці” [1, с. 12].

Ранні Максім Танк пачатку 1930-х гадоў тыпалагічна набліжаны да песеннай народнай творчасці характарам лірычнага героя, пэўнымі асаблівасцямі яе светабачання. Такія вершы паэта, як “Загінуў таварыш…”, “Грукаючы ў дзверы” досыць пераканальна выявілі адметнасць рыс беларуса, адносіны да навакольных з’яў і прадметаў.

У ранняй лірыцы паэт імкнецца, з аднаго боку, да адухаўлення навакольнага свету, а з другога – да апрадмечвання і адухаўлення сэнсавых катэгорый гора, долі, дум.

Максім Танк досыць творча ставіўся да выкарыстання элементаў вуснай народнай творчасці. Малады паэт быў далёкі ад голага захаплення дыялектызмамі, містычнай экзотыкай.

Унутраная генетычная далучанасць да багаццяў фальклору, народнага слова, якое ідзе ад самой “дыялектыкі думак, пачуццяў, ад клопатаў пра нялёгкі хлеб”, акрамя ўсяго, мела тую несумненную карысць, што мацавала патрыятычныя настроі маладога паэта, спяліла яго веру ў сацыяльную свабоду народа, а таксама садзейнічала глыбокаму выяўленню поглядаў на свет, развівала духоўна. Трапнае параўнанне, добрая метафара ў многім спрыялі выпрацоўцы пачаткаў самабытнага пісьма танкаўскай эмацыянальнай ёмістасці: “доля чорнага жыцця” (“Пад шум непагоды”),

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“грамадой… возьмем за грудзі бяду” (“Ходзіць вецер”), “як далонь, помню дно і затокі” (“Над Нараччу”).

Паэт многае пераняў і ад сінтаксісу народных творцаў. Маецца на ўвазе падыход паэта да выкарыстання лексічнага багацця мовы. Шмат у якіх жанрах шырокае распаўсюджанне набыў прыём паўтору слоў і словазлучэнняў. Напрыклад, калі гавораць пра песню, то гэтаму прыёму належыць досыць выжная роля ў раскрыцці асабліваасцяў духоўнага свету герояў, выяўленні зрухаў у эмацыянальна-пачуццёвым стане чалавека.

Загараліся шляхі зорныя –
Зоры зорныя пад паласой;
Пазбіраліся думы чорныя –
Хмары чорныя над галавой [2, с. 89].

Ролю фальклору ў станаўленні паэтычнай індывідуальнасці Максіма Танка цяжка перабольшыць. Шматстайныя жанры вуснай народнай творчасці разглядаліся маладым аўтарам у якасці суб’екта ідэйна-мастацкага акта, крыніцы ўсяго пазітыўнага сцвярджальнага ў жыцці, узору духоўнай сілы і мастацка-эстэтычнай культуры.

Літаратура


1. Танк, М. Аўтабіяграфія / М. Танк / Пяцьдзесят чатыры дарогі : аўтабіяграфія беларускіх пісьменнікаў. – Мінск, 1963. – С. 468.
2. Танк, М. Збор твораў : у 6 т. / М. Танк. – Т. 6. – Мінск, 1981.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ